продолжают развиваться. Поддержка и развитие детских и молодежных коллективов играют решающую роль в формировании будущего белорусской хореографии.

Современная хореография в Беларуси не только приспосабливается к международным стандартам, но и активно ищет свои уникальные формы. Взаимодействие с зарубежными хореографами и педагогами позволило укрепить профессиональные связи и расширить горизонты для белорусских танцоров. Это взаимодействие спровоцировало и новые подходы в преподавании, позволяя учителям адаптировать международные методики к национальным традициям, что создает атмосферу, в которой молодые таланты могут экспериментировать, вдохновляться и развиваться, обозначая тем самым перспективы для будущих поколений.

Нарастающее сотрудничество с зарубежными коллегами создает платформу для организации мастер-классов и тренингов, что способствует росту профессионального уровня местных специалистов. Это взаимодействие также помогает интегрировать новейшие методики обучения и подходы к хореографии в образовательные программы, отвечая современным требованиям индустрии. Это даст возможность формировать гармоничное сочетание теории и практики, привлекая больше молодежи к изучению хореографического искусства, что, в свою очередь, повлияет на дальнейшее развитие хореографического искусства в стране.


*Источники и литература:*

1. Гутковская, С.В. Сценическая хореография Беларуси на современном этапе: состояние и проблемы / С.В. Гутковская // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. – 2008. – № 10. – С. 54-59.
2. Карчевская, Н.В. Изменение структуры эстрадной хореографии в современных условиях / Н.В. Карчевская; [рец.: Ю.М. Чурко] // Вестник молодежного научного общества. – 2004. – № 2 (19). – С. 64-66.


## МАСТАЦКА-ГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ І ЯГО РОЛЯ Ў СТАНАЎЛЕННІ І РАЗВІЦЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МАСТАЦКАЙ ШКОЛЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ ХХ – ПАЧАТКУ ХХІ СТАГОДДЗЯ


М.Л. Цыбульскі (Віцебск)


XX стагоддзе стала важным этапам у фарміраванні Нацыянальнай школы выяўленчага мастацтва. Значную ролю ў гэтым адыгралі створаныя ў гэты час у нашай краіне навучальныя ўстановы.

Пра ролю Віцебскай мастацкай школы і асобных яе прадстаўнікоў у станаўленні Беларускай нацыянальнай мастацкай школы ў першай палове XX стагоддзя не аднойчы пісалі розныя даследчыкі. Прынцыпова адметным стаў удзел выпускнікоў віцебскага мастацкага вучылішча (Беларускага мастацкага тэхнікума) у аднаўленні мастацкай адукацыі на тэрыторыі Беларусі у пасляваенны час. Сярод выкладчыкаў створанай у Мінску мастацкай вучэльні, а пазней і іншых мастацкіх інстытуцый было не мала мастакоў, што прайшлі навучанне ў Віцебску.

Безумоўна, надзвычай важнай з’явай для развіцця Нацыянальнай школы стала рэарганізацыя ў 1952 годзе Беларускага дзяржаўнага тэатральнага інстытута ў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, а пазней і ў Беларускую акадэмію мастацтваў. Адкрыццё ў 1953 годзе мастацкага факультэта са спецыяльнасцямі "Жывапіс", "Графіка", "Скульптура", стварэнне спецыялізаваных кафедр стварылі ўмовы для падрыхтоўкі прафесійных кадраў у гэтай галіне. У 1959 годзе, калі адбыўся

першы выпуск мастацкага факультэта па спецыяльнасцях "Жывапіс", "Графіка", "Скульптура" у краіне адбылося і яшчэ адна важная падзея – у Віцебскім педагагічным інстытуце быў створаны мастацка-графічны факультэт.

Гісторыя мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага інстытута (пазней універсітэта) у агульных рысах напісана [1] і разам з тым роля яго выкладчыкаў і выпускнікоў у развіцці мастацтва другой паловы XX пачатку XXI стагоддзя вызначана не ў дастатковай ступені.

Мэта дадзенага артыкула – праналізаваць ролю мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага інстытута (універсітэта), яго выкладчыкаў і выпускнікоў у развіцці мастацтва другой паловы XX пачатку XXI стагоддзя.

Арыентацыя на падрыхтоўку настаўнікаў малявання чарчэння і працы для агульнаадукацыйных школ, як падкрэслілі ўжо першыя гады існавання Віцебскага мастацка-графічнага факультэта зусім не замінала актыўнай творчай і выставачнай дзейнасці. Гэтаму у значнай ступені садзейнічала цікавасць да творчасці і ўдзел у выставах рознага узроўню старэйшага пакалення выкладчыкаў (В. Дзежыца, Р. Клікушына, Д. Генеральніцкага, І. Сталярова, М. Ганчарова) і моладзі, што ў 60-я прыйшла выкладаць на факультэт (Л.Анцімонаў, В. Ральцэвіч, А. Кавалёў, Я.Красоўскі, А. Някрасаў, А. Арлоў, А. Гаўрушка, І. Хіцько, Ф. Гумен). Маладыя, сапраўды апантаныя творчасцю мастакі, былі выпускнікамі розных вышэйшых навучальных устаноў, у тым ліку і мастацка-графічнага факультэта ВДПІ імя С.М. Кірава, як у той час называўся ВДУ імя П.М. Машэрава. У абласных выставах былі і працы тагачасных студэнтаў – М. Гіргеля, М. Глушко, М. Гугніна, В. Данілава, Ф. Кісялёва, В. Ляховіч, М. Ліханенкі, Я. Панамарэнкі, М. Свістунова, Г. Танковіча, А. Ясюкайць, - сёння вядомых беларускіх мастакоў.

Выставы з удзелам выкладчыкаў і студэнтаў мастацка-графічнага факультэта, праводзіліся пачынаючы з 1965 года. Першая справаздачная выстава твораў мастакоў-педагогаў (Віцебск, 1967) не толькі прадэманстравала ўзровень выкладчыкаў мастацка-графічнага але і пазначыла ў якаясці адной з важнейшых задач аднаўленне“ на новай аснове традыцыі той значнай ролі, якую адыгрывалі паслядоўна мастацкія навучальныя ўстановы Віцебску ў развіцці беларускага савецкага мастацтва” [2, с. 3].

У сярэдзіне 1960-х Фелікс Гумен удзельнічае у вельмі прадстаўнічых выставах (Першая Ўсесаюзная выстава акварэлі, Масква (1965); Выстава беларускіх мастакоў, Парыж, Марсэль (1965); Рэспубліканская выстава твораў мастакоў Віцебскай вобласці (Мінск (1966); Першая рэспубліканская выстава акварэлі, Мінск (1966). У гэты час акварэль становіцца на мастацка-графічным адной з найбольш папулярных тэхнік, набірае моц акварэльная школа [3], На фоне папулярных у той час акварэльных натурных эцюдаў творы Гумена В. Ральцэвіча ўражвалі свабодай абыходжання з акварэллю, эксперыментамі з матэрыялам, бяспрэчным майстэрствам жывапіснасцю, арыгінальнасцю каларыстычных рашэнняў, незвычайнымі кампазіцыйнымі прыёмамі.

Прафесійнаму станаўленню мастакоў ад самага пачатку існавання мастацка-графічнага факультэта спрыяла выкананне дыпломных работ у галіне жывапісу, графікі, скульптуры. Ад пачатку старшынямі дзяржаўнай экзамецыйнай камісіі па абароне дыпломных работ на МГФ былі вядомыя беларускія мастакі сярод якіх П.С. Крахалёў, П.В. Масленнікаў, М.В. Данцыг, У.П. Сухаверхаў і інш., што спрыяла больш адказнаму і сур’ёзнаму падыходу студэнтаў-выпускнікоў да сваіх першых самастойных творчых работ.

Арыентацыя на творчасць праяўляецца як у працы выкладчыкаў, так і накірунках дзейнасці кіраўніцтва факультэта і кафедр, якія арганізуюць сустрэчы студэнтаў з вядомымі мастакамі, ладзяць творчыя выставы студэнцкіх работ, устраўваць іх абмеркаванне, наладжваюць дзейнасць творчых гурткоў.

Сярод удзельнікаў рэспубліканскіх і абласных выстаў у першай палове 1970-х з'явілася немала былых выпускнікоў мастацка-графічнага. У гэты час тэма творчасці была і адной з дамінуючых на занятках па ўсіх мастацкіх дысцыплінах. Жаданне знайсці і зразумець сябе, адкрыць і праявіць сваю індывідуальнасць, смага наватарства ў студэнтаў заўсёды былі побач з жаданнем займацца Мастацтвам.

Стварэнне на мастацка-графічным факультэце эстампнай майстэрні ў 1974 годзе і актыўная педагагічная і творчая праца Л.Анцімонава спрыялі росту папулярнасці графікі сярод студэнтаў. Эстампная майстэрня стала сапраўднай творчай лабараторыяй, месцам для працы гуртка графікі і спадзвігла многіх у той час яшчэ студэнтаў да ўдзелу у выставах.

Месцам працы шэрагу таленавітых выпускнікоў мастацка-графічнага сталі спецыялізаваныя мастацкія майстэрні, што з'яўляліся часткай сістэты Мастацкага фонду СССР. З працай у падобных майстэрнях, якія курыраваліся абласнымі арганізацыямі Саюза мастакоў, многія выпускнікі МГФ, маладыя мастакі звязвалі свае мары пра прафесію "сапраўднага мастака", мары пра творчасць.

У другой палове 1970-х- 1980-я гады вельмі важную ролю у фарміраванні творчай атмасферы на факультэце адыгралі выдатныя мастакі, сярод якіх варта адзначыць А.А. Чміля, А.І. Мемуса, В.А.Ляховіч і супругаў Л.Д. і А.С.Прэсняковых. Усе яны актыўна займаліся творчасцю, прымалі ўдзел у мастацкіх выставах. У 1980-я гады бяспрэчнымі творчымі аўтарытэтамі для студэнтаў МГФ стануць такія мастакі-педагогі, як Я.В.Антонаў, А.Ф.Карпан, М.В Ляўковіч. Гэтыя педагогі шмат часу аддавалі творчай працы і сваім асабістым прыкладам імкнуліся заахвоціць маладых мастакоў.

У 1980-1990-я гады творчая актыўнасць выкладчыкаў кафедры выяўленчага мастацтва надзвычай высокая. Немагчыма не толькі пералічыць, але і абазначыць дыяпазон міжнародных, усесаюзных, рэспубліканскіх і абласных выстаў, на якіх былі прадстаўлены творы актыўнай часткі мастакоў-педагогаў.

У параўнанні з 1960-мі гадамі колькасць сяброў Саюза мастакоў, сярод якіх былі выкладчыкі і выпускнікі МГФ у 1980-я гады значна вырасла. Сёння найбольшую частку сяброў віцебскай абласной арганізацыі Беларускага саюза мастакоў складаюць выпускнікі мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. Дзякуючы іх актыўнай дзейнасці візуальнае мастацтва на Віцебшчыне стала адным з асабліва папулярных відаў у агульнай сістэме мастацтваў. Не без іх удзелу на гэтай зямлі былі арганізаваны шматлікія пленэры (Шагалаўскі, Малевічаўскі, імя Я. Драздовіча, І. Хруцкага, І. Рэпіна), адбываліся разнастайныя акцыі і фестывалі.

Выпускнікі МГФ у розны час выступілі ініцыятарамі стварэння шэрагу творчых аб'яднанняў [5]. Сярод іх першае ў беларускім мастацтве нефармальнае творчае аб'яднанне мастакоў "Квадрат" (1987), у склад якога ўвайшлі мастакі, працуючыя ў розных відах і жанрах мастацтва, разнастайных творчых накірунках. Сярод іх А. Малей, М. Дундзін, А. Дасужаў, А. Слепаў, В. Міхайлоўскі, Т. і Ю. Рудэнка, В. Чукін. В. Шылко, В. Шчасны.

Выпускнік МГФ полацкі мастак Аляксандр Канавалаў у 1990 годзе адкрывае прыватную галерэю "Рыса" вакол якой аб'ядноўваюцца мастакі Полацка. І з'яўляецца аб'яднанне "4-83". Немала былых выхаванцаў МГФ было і сярод удзельнікаў выстаў творчага аб'яднання"Аршыца" (1991).

У 1995 годзе па ініцыятыве выкладчыкаў МГФ створана суполка "Віцебская акварэль". У склад суполкі ўвайшлі мастакі, якія стала працуюць ў акварэлі ў розных манерах і напрамках. Аўтарытэт і прызнанне віцебскай акварэлі прынесла актыўная творчая і экспазіцыйная дзейнасць такіх майстроў як Ф. Гумен, І. Сталяроў, В. Ральцэвіч, Г. Шутаў, В. Лук'янаў, В. Ляховіч, Л. Воранава, М. Ляўковіч, А. Карпан, І. Шкуратаў, М. Драненка, У. Напрэенка, М. Гугнін, Я. Панамарэнка, У. Іваноў, А. Шыёнак, У. Шапо,

А. Кастагрыз, і шэраг іншых. Але кола прадстаўнікоў Віцебскай школы акварэлі было значна шырэй за гэта аб'яднанне. У розных кутках Беларусі школу акварэлі сваёй творчасцю праслаўлялі выпускнікі МГФ розных гадоў, сярод якіх : А. Алонцаў, А. Ясюкаць, М. Аўчынікаў, М. Міронаў, Р. Шаура,С. Харашаўцаў, Р. Мяжуеў і інш.

У Полацку было створана і яшчэ адно творчае аб'яднанне маладых мастакоў, выпускнікоў мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта "Белае кола" (1999)/ Сярод першага склада сяброў аб'яднання А. Пракарына, А. Міхайлаў, А. Елізараў, А. і Т. Піскун, З. Мшар, Э. Лавінскі, С.Чарцілін.

Аўтарам і куратарам вялікай колькасці цікавых праектаў у 1980-я-1990-я гады стаў выпускнік МГФ, а пазней Беларускай акадэміі мастацтваў В. Васільеў. Сярод іх серыя выстаў "in-formation" (1994-2000), штогадовыя праекты «Abstract». У 2000-я такімі ж серыйнымі стануць праекты «Пан-Тон», куратарам якіх выступаў А.Паўлоўскі, таксама выпускніка МГФ.

Сапраўдным барометрам, які доўгі час адлюстроўваў стан сучаснага моладзевага мастацтва з'яўлялася «Арт-сесія», - мастацкая акцыя, якая пачынаючы з 1992 г кожны год праводзілася ў Віцебску і ўключала правядзенне конкурсу-выставы візуальных мастацтваў творчай моладзі. Характэрна, што пачатак «Арт-сесіі», - паклала нефармальная выстава студэнтаў мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута "Гаўдэамус" (сакавік, 1989), а канцэпцыя конкурсу была распрацавана выкладчыкамі гэтага ж факультэта Я. Антонавым і М. Прусаковым і рэалізавана пры падтрымцы кампаніі “Арт-Марк” (кір. М.Раманоўская).

У 1980-1990-я гады даследаванні розных перыядаў развіцця беларускага (у тым ліку віцебскага) мастацтва працягваюцца апантанымі даследчыкамі выпускнікамі МГФ розных гадоў, сярод якіх В.В. Шамшур, Я.М. Сахута, Р.Ф Шаура, У.І. Пракапцоў, Л.Д. Налівайка, У.І. Рынкевіч, М.А. Гугнін, Б.А. Лазука, М.Л. Цыбульскі, М. Міронаў Г.П. Ісакаў. Сярод вышэйпералічаных мастацтвазнаўцаў і аўтары грунтоўнага навуковага выдання, шасцітомнай "Гісторыі беларускага мастацтва" (т. 1–6; 1987-1994).

Выпускнікамі і выкладчыкамі гэтага факультэта за 65 год го існавання зроблена вельмі многпа ў развіцці Беларускай мастацкай школы. Сёння перагортваючы старонкі гісторыі, факультэт з гонарам называе імёны сваіх выпускнікоў розных гадоў, сапраўдных творцаў- вядомых мастакоў. Іх проста не пералічыць. Зарыентаваны на падрыхтоўку настаўнікаў малявання, чарчэння і працоўнага навучання, Мастацка-графічны факультэт, праявіў сябе . “ перш за ўсё, як мастацкая кузня кадраў у самым шырокім сэнсе - кадраў прафесійных жывапісцаў, графікаў, скульптараў, майстроў декаратыўна-прыкладнога і мастацтва.

*Крыніцы і літаратура:*


1. Вінаградаў, В.Н. Гісторыя мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава на старонках друку // Искусство и культура. - 2018. - № 2. - С. 89-94.
2. Цыбульскі, М.Л. Першая справаздачная выстава твораў мастакоў-педагогаў. Віцебск 1967 год // Искусство и культура. - 2017. - № 4. - С. 5-13. URL : https://rep.vsu.by/handle/123456789/12816 (дата обращения: 23.09.2024).
3. Цыбульскі, М.Л. Віцебская школа акварэлі // Бел.Энцыклапедыя ў 18 т., т.4: Мн.: БелЭн.,1997 .с224-225
4. Цыбульский, М.Л Творчыя аб'яднанні мастакоў на Віцебшчыне ў XX стагоддзі.// Искусство и культура. - 2011. - N 3(3). - С. 43–51Ф URL : https://rep.vsu.by/handle/123456789/3377 (дата обращения: 23.09.2024).
5. Цыбульскі, М.Л. Вектары прыярытэтаў: ад прафесіі настаўніка да архетыпа Творцы / М.Л. Цыбульскі // Искусство и культура. – 2019. – № 3. – С. 71–84. URL : https://rep.vsu.by/handle/123456789/19079.(дата обращения: 23.09.2024).